УДК 811.161.3-84

***В.А. Шпакоўская***

# СЕМАНТЫЧНАЕ ПОЛЕ «ЧАЛАВЕК» У БЕЛАРУСКІХ ЛІТАРАТУРНЫХ АФАРЫЗМАХ

*Статья посвящена описанию семантического поля «Человек» в белорусских литературных афоризмах, его дифференциации на тематические группы и микрополя.*

*The article is devoted to the semantic field «Man» description in Belarusian aphorisms, its differentiation into semantic groups and microfield.*

Беларускія літаратурныя афарызмы надзвычай разнастайныя па сваёй тэматыцы [1]. Фактычным матэрыялам даследавання з'яўляецца каля 3000 беларускіх літаратурных афарызмаў, якія на падставе вылучэння ў іх складзе ключавых слоў былі падзелены на шэраг семантычных палей.

Адным з самых вялікіх і значных семантычных палей з'яўляецца семантычнае поле "Чалавек", у межах якога аб'ядноўваецца прыкладна 50% ад агульнай колькасці беларускіх літаратурных афарызмаў. Гэтае поле падзяляецца на наступныя тэматычныя групы: "Духоўны стан чалавека", "Фізічны стан чалавека", "Грамадскі стан чалавека", "Праца і кар'ера", "Сям'я", "Жанчына і мужчына".

1. Тэматычная група "Фізічны стан чалавека" ахоплівае наступныя мікрапалі:

а) "Часткі цела чалавека", напр.: *Я адны на свеце* ***рукі*** *знаю, Што ў мазалях. І ім я давяраю (М. Танк); Найбольш адкрыты нашы* ***вочы*** *Звычайна перад* ***смерцю*** *(Я. Гучок);*

б) "Фізічны стан чалавека", напр.: *На* ***пахілых*** *і сабакі / Брэшуць злосней і гарчэй... (Я. Колас);* ***Смерць*** *– пачатак новага жыцця (Я Колас); Бываюць* ***раны*** *большыя і меншыя. Меншыя – гояцца, і па іх знаку няма. Большыя – гояцца, але па іх застаюцца рубцы. Гэтак на целе. Бываюць раны, большыя і меншыя. Меншыя – гояцца; па іх застаюцца рубцы. Большыя - заўсёды крывавяцца. Гэтак на сэрцы. Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – заўсёды крывавяцца. Большыя – залечвае толькі... смерць. Гэтак на душы (Ядвігін Ш.).*

2. Тэматычная група "Духоўны стан чалавека" з'яўляецца самай вялікай па колькасці афарызмаў і ўключае наступныя мікрапалі:

а) "Эмацыянальны стан чалавека", напр.: *Не аддавай сябе* ***самоце,*** *Заўчасна ёй не саступай (Н. Мацяш); Хто не спытаў хоць раз* ***трывогі***, ***Жыццю*** *не ведае цаны (А. Звонак).*

б) "Характар", напр.: ***Нецярпенне*** *нішчыць надзею... (В. Быкаў); Нікога нельга абавязаць быць* ***шчырым*** *і адкрытым (І. Шамякін);*

в) "Адносіны паміж людзьмі", напр.: *Які* ***прывет*** *– такі* ***прыём***. *Які* ***тавар*** *– такая* ***плата*** *(Я. Колас);* ***Даравацъ*** *– не для кожнага гонар... (В. Аколава);*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сюды ж варта аднесці і афарызмы з ключавым словам “Слава”, напр.: *Ад **сла-вы** галава не баліць, а толькі кружыцца (І. Гурскі); Бывае **слава**, як праклён (В. Зуёнак).*

г) “Сацыяльны стан чалавека”, напр.: *Як пачнуць **музыкі** граць, Загізуе і марудны! (Я. Колас); **Смелы** і ў руцэ з кавалкам ласым, Помні заўсягды пра лёс разуты, Ногі **босаму** не адтапчы! (Р. Барадулін); Вызваленчаму руху прыгнечаных нацый заўжды не хапае кадраў патрыятычнай **інтэлігенцыі**, не стае творцаў і пашыральнікаў ідэй, таму расце высокі прэстыж духоўных каштоўнасцей усіх відаў (У. Калеснік);*

д) “Чалавечыя дзеянні”, напр.: *Дробны **клопат** штодзённага жыцця, нецікавага, часта пустога і нікчэмнага, прыніжае цябе, выціскае з цябе ўсё больш вартоўнае (Я. Колас); Каб мы ведалі ўсе дробядзі жыцця якой-нібудзь казюлькі, мы шмат якіх **памылак** маглі б не зрабіць (А. Мрый);*

е) “Маральныя і духоўныя якасці чалавека”, напр.: ***Дабро** зрабіў – не гой-кай пеўнем (П. Броўка); **Павага** – самае святое, Бо людзей з нас лепіць на зямлі (Н. Мацяш);*

ж) “Заганы”, напр.: *...**гарэлка**, яна горш за радыяцыю для здароўя і без пары губіць мужчынаў (В. Быкаў); Па **п’янцы** можна і Цэзара пераблытаць з кайзерам, і аксакала з саксаўлам (К. Камейша).*

3. Тэматычная група “Грамадскі стан чалавека” складаецца з двух мікра-палей:

а) “Кожны”, напр.: ***Людзі**, як хвалі ў рэчцы: ідуць адна за другою, покі не закалыша іх цішыня... (Я. Колас); Кожны **чалавек** – гэта цэлы свет (К. Чорны); **Адным** ляцець высока; ходам крэсным Паўзці **другім**, хто розумам аглух (А. Звонак);*

б) “Народ”, напр.: ***Народ** – гэта нешта большае чым сума адзінак (В. Іпатава); Кожны **народ** мае свой твар (Я. Колас).*

4. Тэматычная група “Сям’я” ўключае наступныя мікрапалі:

а) “Бацькі” (значная частка афарызмаў гэтага мікраполя належыць адначасова мікраполю “Дзеці”), напр.: *І **бацьку** скора **сын** забудзе – Каротка памятка аб людзе, Аб простым людзе (Я. Колас); **Мама** – Пасярэдніца між Богам і сынам – Дзеліцца небам і хлебам адзіным (Р. Барадулін);*

б) “Дзеці”, напр.: ***Дзеці** – І Гасподні дар, і кара Усім **бацькам** за іхныя грахі (Р. Барадулін); **Дзеці** – радасць і прыгажосць усіх народаў свету (Я. Брыль);*

в) “Сямейныя адносіны, родныя”, напр.: *У **сям’і** толькі здраду нельга да-раваць (І. Шамякін); **Раднёю** і **мовай** не грэбуй, Ты – колас сярод каласоў... (С. Законнікаў).*

5. Тэматычная група “Мужчына і жанчына” з’яўляецца самай малой па колькасці афарызмаў і маркіруецца такімі ключавымі словамі, як “Жанчына”, “Жонка”, “Дзяўчына”, “Мужчына”, “Мужык” і інш., напр.: ***Жанчына** – душа*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***мужчыны****; яна наша натхненніца на вялікія справы (Я. Колас);* ***Жанчыны*** *панствуюць і ў мане, А* ***мужчыны*** *і ў праўдзе – рабы (У. Караткевіч).*

Семантычнае поле “Чалавек” з’яўляецца адным з найбольш значных у зместавай прасторы беларускай афарыстыкі. Па словах даследчыцы рускіх літаратурных афарызмаў А.В. Каральковай, “у межах семантычнага поля *чалавек* падымаюцца і вырашаюцца праблемы чалавечай адказнасці за ўсё што адбываецца ў дзяржаве, аб небходнасці працы і труда, якія з’яўляюцца неабходнай умовай існавання чалавека” [2, с. 121], таму гэтае поле вельмі шчыльна звязана ў беларускіх афарызмах з тэматычнай групай “Праца”, напр.: ***Папрацуй*** *як трэба, то будзеш спаць, хоць шылам калі (Я. Колас); Адзіна* ***праца*** *і* ***каханне*** *У жыцці апірышча і шчыт (Н. Мацяш).*

Беларускія пісьменнікі-афарысты высмейваюць заганы чалавека, напр.: *Калі* ***розум*** *слабаваты, Не віні падкоўкі (М Лужанін);* ***Малому велічч*у** *быць хочацца заўсёды (К. Крапіва).* Аўтары афарызмаў часта заклікаюць да развіцця станоўчых рыс характара і пазбаўлення ад благіх, напр.: ***Дабро*** *зрабіў – не гойкай пеўнем (П. Броўка); Хто носьбіт ёсць пачатку* ***злога****, Не патурай таму ні-ні (Я. Колас); Ад* ***праўды*** *раз адкруцішся –* ***Няпраўдаю*** *атруцішся (П. Панчанка).*

Тэматычная група “Духоўны стан чалавека” вельмі цесна звязана з семантычным полем “Абстрактныя паняцці”, у першую чаргу, праз такія ключавыя словы, як “Дабро”, “Зло”, “Каханне”, “Шчасце” і інш., напр.: *Важны, і галоўны, і самы светлы талент –* ***дабрата*** *(С. Грахоўскі);* ***Шчаслівым*** *зайздросцяць. Але часта шчаслівых не любяць (І. Шамякін).*

Афарызмы семантычнага поля “Чалавек” суадносяцца з выслоўямі амаль што ўсіх іншых палей, але больш за ўсё з такімі тэматычнымі групамі, як “Жыццё”, “Абстрактныя паняцці”, “Рэлігія”, “Грошы (Багацце)”, “Літаратура і мастацтва”, “Лёс”, “Час”, “Мова (Слова)”, “Думка” і інш., напр.: *Скажаш* ***слова*** *не такое – Быць* ***бядзе*** *(Я. Колас); Каб мацней паверыць, трэба начынаць з* ***сумнення****, а каб мацней палюбіць – з* ***нянавісці*** *(А. Карпюк).*

## Літаратура


1. *Іваноў, Я.Я.* Праблемы лінгвістычнага вывучэння літаратурнай афарыстыкі (аналітычны агляд) / Я.Я. Іваноў // Праблемы беларускага літаратуразнаўства / рэд. С.І. Даніленка, Я.Я. Іваноў. – Мінск: МНТ, 2000. – С. 274–286. – (Terra Alba. Т. 1)
2. *Королькова, А.В.* Руская афористика / А.В. Королькова. – М.: Флинта: Наука, 2005. – 344 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова